**І.М. Шаруха *(Магілёў)***

# СТРУКТУРА І ЗМЕСТ КУРСА "ГЕАГРАФІЯ БЕЛАРУСІ": ГІСТАРЫЧНЫ АСПЕКТ

Пасля завяршэння "эпохі А.Смоліча", з пачаткам кампаніі па барацьбе з "беларускім нацыяналізмам", школьныя праграмы 1930–40–х г.г. перасталі патрабаваць вывучэння геаграфіі сваёй мясцовасці. Курса геаграфіі Беларусі не было нават на геаграфічных факультэтах ВНУ.

Пастанова СНК "Аб мерапрыемствах па паляпшэнню якасці навучання", праграма 1951 г. паспрыялі выданню першага дапаможніка для настаўнікаў і студэнтаў В.Дзяменцьева і М.Раманоўскага "Геаграфія Беларускай ССР" (1952). Кніга ўключала ўводзіны (утварэнне БССР, межы, тэрыторыя, тэрытарыяльнае афармленне, адміністрацыйны падзел, насельніцтва, агульныя рысы прыроды), дзве часткі – па фізічнай і эканамічнай геаграфіі з 18 параграфамі.

У 1954 г. у праграмах і адпаведна ў падручніках па геаграфіі СССР для 7 класа з'явіўся раздзел "Вывучэнне сваёй вобласці", на якую адводзілася толькі 3 г. Гэты раздзел у 1958 г. перарос у асобны курс "Геаграфія БССР". У 1960 г. у адпаведнасці з паслярэформеннымі праграмамі В.Жучкевічам і В.Якушкай была выдадзена "Геаграфія Беларускай ССР" (10 выданняў). Гэты аўтарскі тандэм праіснаваў да пачатку 1970–х гадоў, калі В.Жучкевіч стварыў новы падручнік для 7–8 класаў (10 выданняў; увёў, у параўнанні з папярэднім падручнікам, шэраг пытанняў, у т.л. тэктонікі, краявідазнаўства, пашырыў геалагічны матэрыял). Структура дапаможнікаў і падручнікаў названых аўтараў была падобнай да структуры дапаможніка Дзяменцьева і Раманоўскага, падручнікаў па геаграфіі СССР – спачатку вывучаюцца асобныя кампаненты прыроды, потым – насельніцтва і галіны гаспадаркі, кароткае апісанні абласцей.

Змест, структура падручніка па геаграфіі Беларусі Жучкевіча былі дасканала распрацаваны - па сваіх дыдактычных якасцях ён не саступаў аналагічным падручнікам па геаграфіі іншых рэспублік.

Рэфармаванне школы ў канцы 1980-х г.г. патрабавала стварэння новых падручнікаў па геаграфіі рэспублікі. Дадзеная адказная справа была даручана прафесару С.І.Сідору.

Асаблівасцямі зместу і структуры падручніка "Геаграфія Беларусі" (для 8–9, потым для 9-х класаў; 4 выданні 1989–92 г.г., агул.тыр. 514 тыс. паас.) С.Сідора з'яўляюцца наступныя: 1. дакладная структурыраванасць: раздзел – параграф - пункт – выснова; 2. размяшчэнне матэрыялу адпавядае схеме, што распрацавана ім у манаграфіі ("Социально – экономическая география СССР: наука и учебная дисциплина", 1989): прыродныя рэсурсы - прырода - насельніцтва-гаспадарка. 3. гаспадарка вывучаецца па МГК



Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

у парадку: ПЭК – машынабудаўнічы – хімічны – сацыяльны – АПК – леса хімічны - будаўніча–прамысловы – транспартны. 4. значнае месца адводз іцца паняццям, законам і заканамернасцям. 5. увядзенне (упершыню ў гісто рыі школьных падручнікаў) паняццяў "раён", "прыродна – гаспадарча раянаванне".

Пашырэнне праграмы прывяло С.Сідора спачатку да распрацоўкі но вага падручніка (1993), а потым і дадатку да яго (каб: 1. змест курса адпа вядаў аўтарскай праграме; 2. не засталіся па–за навучальным полем пы танні, што былі "вынесены" з папярэдніх курсаў - геалагічная гісторыя геалагічная будова і інш.).

Упершыню ў школьны курс па геаграфіі Беларусі прафесарам Сідорам быў уведзены матэрыял аб тэктанічных рухах, геалагічным летазлічэнні глебаўтваральных фактарах і працэсах, аб зонах адпачынку і курортах як аб элементах рэкрэацыйных рэсурсаў, сутнасці рынкавых адносін, мадэ лях эканамічнага развіцця, рынку; па гісторыі даследаванняў, аб праблемах занятасці, сістэме рассялення, геаграфіі народных промыслаў; пытанн аб новых формах гаспадарання, аб праблемах і напрамках сацыяльна–эканамічнага развіцця Беларусі, пытанні раянавання (у т.л. прыродна–гаспадарчага), геаграфічных назваў. Сяргей Іванавіч адрадзіў этнаграфічны матэрыял (строі аддзення, нацыянальная самабытнасць), накірунак на эканамічную падрыхтоўку навучэнцаў.

У перапрацаваных падручніках (выданні 1995, 1998, 2000 г.г. аб'ём "вырас" з 197 да 286 с., адпаведна павелічэнню колькасці гадзін удвая) навучальны матэрыял размяркоўваўся па 10 раздзелах і 63 параграфах Раздзел 1. Беларусь – краіна ў цэнтры Еўропы (7 тэм). Раздзел 2. Прыродныя ўмовы і рэсурсы (9 тэм). Раздзел 3. Прыродакарыстанне (5 параграфаў аб прыродных рэсурсах, асвоеннасці, краявідах). Раздзел 4. Насельніцтва (6 тэм). Раздзел 5. Агульная характарыстыка гаспадаркі (6 тэм). Раздзел 6. Вытворчасць тавараў спажывання і паслуг (9 тэм). Раздзел 7. Цяжкая прамысловасць і транспарт. Тэрытарыяльная структура гаспадаркі (6 тэм; міжгаліновыя комплексы). Раздзел 8. Раянаванне Беларусі (7 тэм). Раздзел 9. Вобласці (6). Раздзел 10. Беларусь у еўрапейскай і сусветнай супольнасці (2).

У падручніках С.І.Сідор упершыню ўвеў 10 грунтоўна прапрацаваных раздзелаў па геаграфіі рэспублікі; для аблягчэння ўспрымання матэрыялу выкарыстаў вельмі цікавы метадычны прыём - спачатку прапанаваў вывучэнне сацыяльнага комплексу, а ўжо потым – АПК і цяжкой прамысловасці; увёў пытанні ТСЭС, пазнаёміў вучняў з пытаннямі раянавання (ПГР), узмацніў культуралагічны, гуманістычны, гуманітарны аспекты школьнай геаграфіі.



Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова